**Таццяна Аляксандраўна Грышко (1954-2018), спартсменка (інваспорт, стральба з лука), чэмпіёнка IX Паралімпійскіх гульняў (1992, Барселона)**



Таццяна Аляксандраўна Грышко нарадзілася 28 верасня 1954 года ў в. Бакінічы Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. З васьмі гадоў у Таццяны ў выніку поліяміэліту паралізаваны ногі. Школьную праграму асвойвала ў асноўным на даму. Сярэднюю школу скончыла ў спецшколе-інтэрнаце.

У 1975 годзе закончыла Пінскі ўлікова-крэдытны тэхнікум. З 1976 года працавала вядучым спецыялістам гарадскога аддзела Дзяржбанка ў г. Брэсце.

Спартыўная біяграфія Таццяны Грышко пачалася ў 1989 годзе ў фізкультурна-спартыўным клубе таварыства інвалідаў “Шанс”, дзе яна стала займацца стральбой з лука. Удзельнічала ва ўсіх спаборніцтвах. У 1990 годзе ў Магілёве стала першай чэмпіёнкай СССР сярод інвалідаў. Спорт прынёс у яе жыццё новыя фарбы і эмоцыі, дазволіў адчуць сябе паўнавартым чалавекам. І няхай перамогі прыйдуць не адразу – не трэба баяцца цяжкасцей, бо галоўнае ў гэтай справе – перамога над сабой.

У 1990 годзе ў Нідэрландах на чэмпіянаце свету Таццяна Грышко стала бронзавым прызёрам (г. Асен). Праз год Таццяна выйшла замуж, мужам стаў яе трэнер Вячаслаў Міхайлавіч Іванчук.

У 1991 годзе на чэмпіянаце Еўропы ў Бельгіі заваявала бронзу ў асабістым заліку і золата ў камандным першынстве (г. Антверпен). Чэмпіёнка СССР (1989–1991) і СНД (1992, г. Чэбаксары, Расія). Таццяна Грышко – чэмпіёнка IX Паралімпійскіх гульняў 1992 года ў Іспаніі (Барселона). У Барселону ехала ў складзе зборнай каманды СНД, не думалася, што стане чэмпіёнкай, але ўвайшла ў гісторыю. Па-першае, гэта быў першы залаты медаль Беларусі на летніх Паралімпіядах. Па-другое, наша спартсменка стала адзінай з каманды СНД, каму пашчасціла падняцца на вышэйшую ступень п’едэстала.

Брэсцкая лучніца таксама мнагакратная чэмпіёнка Беларусі (1993–2004), рэкардсменка свету 1995 года (Францыя), уладальніца Кубка Францыі (1997), удзельніца Паралімпійскіх гульняў у Атланце (1996), Афінах (2004), бронзавы прызёр чэмпіянатаў Еўропы (2006).

Трэніравалася Таццяна Грышко ў Брэсцкім дзяржаўным абласным вучылішчы алімпіскага рэзерву ў настаўніка Міхаіла Уладзіміравіча Пузяка.

29 кастрычніка 2011 года побач з плошчай «Алімпійская слава Брэстчыны» г. Брэста (вул. Маскоўская) прайшла закладка алеі Алімпійскай славы з 16-ці серабрыстых клёнаў – па ліку брэсцкіх спартсменаў, якія заваявалі медалі Алімпійскіх і Параалімпійскіх гульняў. Сярод іх – чэмпіёнка Паралімпійскіх гульняў у Барселоне (1992), ураджэнка Піншчыны Таццяна Грышко. Яе лёс – узор чалавека, які стварыў сябе. Жывы прыклад,

здольны прывесці на стадыён іншага чалавека, для каго прырода або няшчасны выпадак таксама паставілі, як яму пакуль прадстаўляецца, непераадольныя бар’еры.

Таццяна Аляксандраўна Грышко памерла 6 сакавіка 2018 года пасля працяглай хваробы. Пахавана ў роднай вёсцы Бакінічы Пінскага раёна.


1. **Гришко** Татьяна Александровна // Регионы Беларуси: энциклопедия: в 7 т. Минск, 2009. Т.1. Кн.1. Брестская область. С. 304
2. **Гришко** Татьяна Александровна / Т. В. Люкович // Спортивная энциклопедия Беларуси. Минск, 2005. С.155
3. **Верная** рука. Татьяна Гришко // Брестчина олимпийская / автор А. М. Суворова. Брест, 2009. С.136–138. (Принимая вызов)
4. **Гришко** Татьяна Александровна // Спортсмены Пинщины /авт.-сост. И. А. Кибак. Минск, 2004. – С.44
5. **Ребковец, Я.** Памяти чемпионки : [о первой паралимпийской чемпионке Беларуси Татьяне Гришко ; родилась в д. Бокиничи Пинского района] / Янина Ребковец // Полесская правда, Пинск. 2018. 31 марта (№ 26). С. 9.
6. **Умерла** первая паралимпийская чемпионка Беларуси Татьяна Гришко : [родилась в д. Бокиничи Пинского района] / по материалам информагенств // Вместе!. 2018. 16 марта (№ 11). С. 3.
7. **Сарычев, В.** Преодоление барьеров: шипы и розы параолимпийской чемпионки Татьяны Гришко / Василий Сарычев // Вечерний Брест. 2009. 14 августа. С. 8. (Достоинство натуры)
8. **В Бресте** заложена аллея Олимпийской славы // Навіны Камянеччыны. 2011. 1 лістапада. Режим доступа: // http://www.kamenec.by/
9. **В Бресте** заложена аллея Олимпийской славы. Режим доступа: // http://belsmi.by/ru/smi-news/v-breste-zalozhena-alleja-olimpijskoj-slavy
10. **Гришко** Татьяна Александровна. Режим доступа: //http://www.sportbrest.by/sportivnye-uslugi/item/40-grishko-tatyana-aleksandrovna